Такім чынам, з усяго вышэйадзначанага відаць, што галоўная роля ў стварэнні паэтычных вобразаў русальных песень адводзіцца прамым апісанням, якія захоўваюць у сабе ўяўленні пра іх сутнасць. Адсутнасць у тэкстах указанняў на ўяўленні пра зрокава ўспрымаемыя вобразы і, адпаведна, іх матэрыялізацыі ў выглядзе спецыяльных сродкаў тыпу эпітэтаў указвае на спецыфіку адлюстраванай у русальных песнях рэчаіснасці, якая "дыктавала" апеляцыю менавіта да акцыянальнасці, дзе зафіксавалася памкненне старажытнага чалавека і вербальна падмацаваць, узнавіць дзеянне праз спецыфічны моўны сродак – прамое апісанне, якое не дазволіла развіцца азначальнасці ў сілу надзвычайнай замкнёнасці русальных тэкстаў (якая, дарэчы, характарызуе і ўсю русальную абраднасць як культурную з'яву). Актыўнае ўжыванне апісальнасці і зусім нязначнае выкарыстанне азначальнасці ў дачыненні да вобразаў русальных песень – спецыфічная рыса як паэзіі рытуалу, так і архаічнай паэтыкі ўвогуле, калі ўвага канцэнтравалася перш за ўсё на дзеяннях, што, у сваю чаргу, вымагала вылучэння адпаведных сродкаў вербальнай перадачы інфармацыі.


1. Веснавыя песні / Склад. Г.А. Барташэвіч, Л. Салавей. Мн., 1979.
2. Івахненка Т. "Ах, мая русалачка, летні ты цвяточак ..." Абрад "Провады русалкі" ў сучасным выяўленні // Роднае слова. 1995. №5.
3. Івахненка Т. Семантыка вобраза русалкі // Роднае слова. 1997. №5.
4. Ліцьвінка В.Д. Святы і абрады беларусаў. Мн., 1998.
5. Сысоў У.М. З крыніц спрадвечных. Мн., 1997.



***А.М.Нароўская (Мінск)***


## ПРАДМЕТЫ ІНТЭР'ЕРА БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ЖЫЛЛЯ Ў ЗВЫЧАЯХ І АБРАДАХ ЖЫХАРОЎ УСХОДНЕПАЛЕСКАГА РЭГІЁНУ

Найбольш пачэснай часткай інтэр'ера беларускага народнага жылля кан.XIX – пач.XX стст. быў чырвоны кут («покуць»). Прастора у чырвоным куце мела ярка выражаны знакавы характар. Яе каштоўнасць узрастала ў кірунку да самага сакральнага месца – пад абразамі. Сядзець «на куце» лічылася пачэсным у беларускіх сялян, тут звычайна сядзеў гаспадар хаты альбо званыя госці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Семіятычная роля чырвонага кута падкрэслівалася і тым, што тут захоўваліся найбольш значныя культурныя сімвалы: абразы, Біблія, малітоўныя кнігі, крыж, свечкі, а пазней і фотаздымкі памёрлых сваякоў. За абразамі знаходзіліся і галінкі вярбы, якія асвячаліся ў "вербную нядзелю". Дзякуючы высокаму семіятычнаму статусу пад час свят, вярба сакралізавалася і выкарыстоўвалася супраць хваробы і навальніцы. Так, у в. Дубровіца Хойніцкага р-на Гомельскай вобл. «як грыміць ставяць у хаце на куце вярбу, а як моцна грыміць у вакно затыкаюць". А ў Мазырскім раёне "як ідзе град, дык паляць свечану вярбу, каб дым шоў у комін"[1].

Чырвоны кут быў звязаны з абрадамі, якія рэгулявалі сацыяльны аспект жыцця чалавека, яго сацыялізацыю і дэсацыялізацыю. Пры цяжкіх родах жанчыну абводзілі вакол стала.

Е.Раманаў адзначае, што неабходна было абвесці рожаніцу вакол стала, засланага настольнікам, дзеля таго, каб нарадзіўшыйся быў прывязаны да дома і жыў у дастатку. Такім чынам, стол уключаўся ў сістэму ўяўленняў аб добрым сыходзе родаў.

Асаблівая роля адводзілася сталу, як і ўсёй застольнай прасторы ў вясельнай абраднасці. Так, згодна матэрыялам П.В.Шэйна, у в.Дзякавічы Мазырскага ўезда дзяўчына ў знак згоды выйсці замуж брала з сяней стол, ставіла яго на "покуце", дзе сядзеў сват, і накрывала настольнікам [2, с.394]. У этнаграфічных апісаннях штораз прыгадваецца і аб тым, што перад тым, як ехаць у царкву, бацькі благаслаўлялі маладых і тройчы абводзілі вакол стала.

Не менш значнай лічылася прастора чырвонага кута ў пахавальнай абраднасці. Устойлівая сувязь чырвонага кута з комплексам уяўленняў аб смерці, продках праяўляецца ў дні памінання дзядоў. На саракавы дзень чакалі нябожчыка дахаты. У вялікім куце слалася чыстая пасцель для госця. На стол ставіўся дадатковы посуд.

Устойлівае дыяганальнае размяшчэнне чырвоны кут – печ толькі падкрэслівае іх сувязь. Характэрна, што некаторыя абрады маглі адбывацца як каля печкі, так і ў чырвоным куце (напрыклад,прыабшчэнне нявесты да дома жаніха ў вясельным абрадзе і г.д.). Печ займала выключнае месца ў вясельных абрадах і звычаях беларусаў. З

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

этнаграфічных звестак вядома, што на Усходнім Палессі як сваты першы раз прыйдуць да дзеўкі, то яны, ўвайшоўшы ў хату, трохі сутрымоўваюцца каля печы й кажуць ціхенька – печ, печ, памажы, – потым ужо кажуць дабрыдзень ды праходзяць к сталу" (в.Колкі) [3, с.175]. Згодна звычаю ў в.Чапаеўка Нараўлянскага раёна Гомельскай вобл., перад прыходам сватоў, нявеста залазіла на печку. У выпадку нязгоды выйсці замуж яна заставалася там сядзець. Калі ж была згодна пакінуць бацькоўскую хату, то дзяўчына злазіла з печкі [4]. Печ і пячны слуп ва Усходнім Палессі фігуравалі і ў абрадзе, які выконвалі ў сувязі з надыходам родаў.

Выразна бачна сувязь з печчу і агнём як жыццёвым пачаткам у пахавальнай абраднасці. Калі чалавек паміраў, адчынялі юшку коміна, дзверы. Чалеснік печы і пячное начынне беларусы таксама надзялялі магічнай сілай. Так, па дадзеных інфарматараў, у шэрагу раёнаў Гомельскай вобласці, вяртаючыся пасля пахавання дахаты, браліся за "чалеснік" печы, каб не баяцца нябожчыкаў і пазбавіцца ад пагрозы смерці. У гэтым звычаі печ выкарыстоўвалі дзякуючы распаўсюджаным уяўленням аб ачышчальных якасцях агню.

Пячное начынне па гэтай жы прычыне разглядалася ва Усходнім Палессі як магічны сродак у барацьбе супраць "нябеснай" вады. Універсальным сродкам для папярэджвання граду, дажджу ці буры з'яўлялася выкідванне на вуліцу хлебнай лапаты. Так, па звестках А.Е.Красакова (1904 г.н. в. Аляксандраўка Кармянскага р-на Гомельскай вобл.) «каб град скончыўся, выкідывалі з хаты крыж накрыж хлебную лапату і памяло». У Хойніцкім раёне, каб навальніцы не было, выстаўлялі на вуліцу дзяжу. У в. Кіраў Нараўлянскага раёна Гомельскай вобл., каб спыніць моцны дождж, адчынялі комін [5].

Этнографы зафіксавалі мноства магічных абрадаў, звязаных з вокнамі і дзвярыма. Прарубліванне вакон і дзвярэй падчас будаўніцтва дома адпавядала галоўным прыметам жылля жывога чалавека. У звычаі забіваць вокны ў пакінутай хаце можна бачыць не толькі утылітарны, але ж і больш глыбокі, міфалагічны сэнс (дом без акон – нежылы дом).

На ўсёй тэрыторыі Беларусі, у тым ліку на Гомельшчыне, было распаўсюджана павер'е, што на "святкі" нячыстая сіла" можа пашкодзіць людзям. Таму існавала

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цэлая сістэма сімвалічных спосабаў ачышчэння: абломкі касы, нож ці чацвярговую свечку ўтыкалі ў шчыліну парога; развешвалі крапіву над аконнымі праёмамі. Зразумела, што гэтыя магічныя сродкі павінны былі, па меркаванні нашых продкаў, узмацніць сілу сапраўдных запораў.

Вялікая роля парога ў этыкетных сітуацыях. Згодна этнаграфічным дадзеным: "Ніколі не вітайся цераз парог, бо з тым чалавекам хутка пасварышся" [6, с.208], "Нічога не давай праз парог".

Акно – гэта своеасаблівыя вочы дома, якія дазвалялі бачыць усё, што адбываецца па-за межамі жылля. У той жа час праз вокны маглі пранікнуць не толькі сонечнае святло, але ж і чужы позірк, небяспека. І таму невыпадкова з'явіліся аканіцы, ва ўзорах якіх былі знакі – абярэгі, якія мелі ахоўную функцыю.

Акно мела асаблівую ролю ў пахавальных абрадах. Згодна этнаграфічным крыніцам, як толькі чалавек паміраў, хутчэй на вокны ставілі шклянкі з чыстаю вадою, каб душы было ў чым памыцца. Такім чынам, праз акно адбывалася сімвалічная сувязь са светам памёрлых. Аб гэтым сведчаць таксама матэрыялы А.Сержпутоўскага: «Каб чалавеку лягчэй было паміраць, трэба было адчыніць вокны або дзверы, а то яшчэ і лепей адкрыць комін, каб зрабіць гатовую дзірку, праз якую выходзіць душа". Такім чынам, вокны і дзверы мелі высокі семіятычны статус. Яны суадносіліся з ідэяй уваходу, пранікальнасці, сувязі жылля са знешнім светам. Адсюль існаванне сістэмы сімвалічных спосабаў ачышчэння і засцярогі ад пранікнення злых сіл у жыллё.

Зыходзячы з вышэйсказанага аб выкарастанні прадметаў інтэр'ера ў звычаях і абрадах беларускага народа, можна казаць аб шматзначнасці іх функцыянальнага прызначэння. Гэта перш за ўсё функцыі аховы будучага ураджаю, аховы здароўя людзей і хатніх жывёл. Абрадавыя дзеянні з прадметамі інтэр'ера ў многіх выпадках былі абумоўлены захаванасцю перажыткаў язычніцкіх вераванняў, аб чым сведчаць рытуальныя дары-ахвярапрынашэнні ў выглядзе частавання коміна, дароў духам новага дома пры перасяленні, ахвярапрынашэнні пячному слупу, задабрыванні "дзядоў" і дамавога. Як сведчаць этнаграфічныя матэрыялы, к канцу XIX – пач.XX

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сгст. сэнс абрадаў часта быў страчаны ці набыў новае тлумачэнне.


1. Матэрылы экспедыцыі Беларускага дзяржаўнага музея народнай
2. архітэктуры і побыту (БДМНАП) у Хойніцкі і Мозырскі р-ны ў 1981 г.
3. Шейн П.В.Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края.Т.3. – СПб, 1902.
4. Сержпутоўскі А.Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. – М., 1930.
5. Матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Нараўлянскі р-н у 1981 г.
6. Матэрылы экспедыцыі Беларускага дзяржаўнага музея народнай
7. архітэктуры і побыту (БДМНАП) у Кармянскі і Нараўлянскі р-ны Гомельскай вобл. у 1982 г.
8. Сержпутоўскі А.Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў – М., 1930.


***Новак В.С. (Гомель)***

## НАРОДНЫ ДЭМАНАЛАГІЧНЫ ПАНТЭОН УСХОДНЯГА ПАЛЕССЯ

Арганічную частку этнічнай культуры беларусаў складаюць міфалагічныя ўяўленні жыхароў Гомельшчыны. Асабліва ўстойліва захоўваюцца ў памяці інфарматараў звесткі пра ніжэйшых міфалагічных персанажаў. Амаль усе міфалагічныя істоты, паводле народных уяўленняў, абазначаюць сваімі дзеяннямі пэўную прысутнасць у розных адрэзках часу і прасторы. Па сутнасці, разнастайнасць вераванняў, звязаных з ніжэйшымі міфалагічнымі духамі – гэта адлюстраванне не толькі імкнення продкаў растлумачыць сэнс жыцця, стасункаў з прыродай, але і звязаць свой дабрабыт з нябачным уплывам звышнатуральных істот. Як сведчаць прадстаўленыя ніжэй фрагменты з успамінаў міфалагічных аповедаў беларусаў-палешукоў, для іх светапогляду характэрны амбівалентнасць, сінкрэтычнасць, гарманічнасць успрыняцця свету.

Звернемся да характарыстыкі народнай дэманалогіі Палесся, у прыватнасці Гомельшчыны, якая ў дадзеным выпадку разглядаецца як культурная прастора, што супадае з межамі беларускага Усходняга Палесся. У сувязі з тым, што некаторыя фальклорна-міфалагічныя з'явы маюць тэндэнцыю да пашырэння свайго арэалу. мы будзем аналізаваць і матэрыялы, запісаныя ў сумежных раёнах.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ